Заданні абласной віктарыны па жыцці і творчасці І.Мележа

*Паважаныя ўдзельнікі віктарыны! Выберыце і адзначце правільны варыянт адказу.*

---

Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка, час выканання задання

1. Якія з ніжэйпералічаных дат адпавядаюць гадам жыцця і творчасці Івана Паўлавіча Мележа?
а) 1921—1976;
б) 1917—1995;
в) 1914—1978;
г) 1912—1995;
д) 1930—1984.

2. «Ёсць у кожнага свой, мілы сэрцу куток, які з бегам гадоў не толькі не цьмее ў памяці, а становіцца як бы яснейшым, даражэйшым... куток нашага маленства», – з любоўю і цеплынёй сказана І.Мележам пра родныя мясціны. Назавіце іх.
а)Вёска Пількаўшчына Мядзельскага раёна Мінскай вобласці.
б)Вёска Глінішчы Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці.
в)Вёска Саматэвічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці.
г)Вёска Карма Добрушскага раёна Гомельскай вобласці.

3. Паводле сацыяльнага паходжання І.Мележ належыць да:
а) сялян
б) рабочых
в) інтэлігенцыі
г) духавенства
д) дваран

4. І.Мележ меў адукацыю:
а) пачатковую
б) незакончаную сярэднюю
в) сярэднюю
г) вышэйшую
д) аспірантура

5. Асноўнай прафесіяй І.Мележа была:
а) журналістыка
б) выкладчыцка-педагагічная дзейнасць
в) навуковая дзейнасць
г) выкладчыцка-педагагічная дзейнасць ў спалучэнні з навуковай
д) чыноўніцка-пісьменніцкая дзейнасць (праца ў Саюзе пісьменнікаў БССР**)**

6. І. Мележ:
а) меў ганаровае званне народнага пісьменніка Беларусі
б) меў ганаровае званне народнага паэта Беларусі
в) меў ганаровае званне народнага артыста Беларусі

г) меў ганаровае званне заслужанага настаўніка Беларусі
д) не меў ніякага ганаровага звання, звязанага з творчасцю, культурай і адукацыйна-асветніцкай дзейнасцю

7. Асноўнай галіной творча-пісьменніцкай дзейнасці ў І.Мележа з'яўлялася:
а) паэзія
б) проза
в)драматургія
г) мемуарыстыка
д) літаратурная крытыка

8. І.Мележ з'яўляўся лаўрэатам:
а)Дзяржаўнай прэміі (рэспубліканскай і агульнасаюзнай) і Ленінскай прэміі (вышэйшай дзяржаўнай прэміі СССР)
б)Нобелеўскай прэміі
в)Ганкураўскай прэміі
г)Пулітцараўскай прэміі

9. І.Мележ пачаў сур'ёзную (сталую) творчую дзейнасць у:
а) 1920-х гг.
б) 1930-х гг.
в) 1940-х гг.
г) 1950-х гг.
д) 1960-х гг.

10. Першай сур'ёзнай мастацкай рэччу (апавяданнем, аповесцю, для паэта – паэмай ці зборнікам), своеасаблівым мастацкім дэбютам, крокам у “вялікую” літаратуру стала (стаў) для І.Мележа:
а)апавяданне “На скрыжаванні”
б)апавяданне “Павел прыехаў”
в)апавяданне “У завіруху”
г)аповесць “Дом пад сонцам”
д)аповесць “Таварышы”

11.Самай вядомай мастацкай рэччу І.Мележа, своеасаблівай візітнай карткай для яго як пісьменніка (паэта) стала (стаў):
а)апавяданне "На скрыжаванні"
б)раманная трылогія "Палеская хроніка"
в)раман "Мінскі напрамак"
г)п'еса "Дні нараджэння"

12. Усе мары гэтага героя І. Мележа звязаны з уласнай зямлёй: «Кеб з таго кавалка, што каля цагельні, дасталося б. То б надзел буў!». Завуць гэтага персанажа:

а)Міхал
б)Васіль Дзяцел
в)Аліндарка
г)Лявон Бушмар
д)Пятрок Багацька

13. Першай спробай працы І.Мележа ў галіне буйной эпічнай формы (рамана) стаў твор:
а)“Подых навальніцы”
б)“Завеі, снежань...”
в)“Мінскі напрамак”
г)“Гарачы жнівень”
д)“Людзі на балоце”

14. Якія з ніжэйпералічаных дат адпавядаюць гадам жыцця І.Мележа ў Бугуруслане?
а)1942—1943;
б)1944—1945;
в)1943—1944;
г)1942—1944.

15. Як увайшоў у жыццё І.Мележа гэты далёкі заволжскі горад?
а)Апынуўся ў Бугуруслане пасля лячэння ў шпіталі; працаваў ваенруком у педінстытуце і адначасова вучыўся завочна ў гэтай навучальнай установе. Тут ён пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай Лідзіяй Пятровай, з якой у 1946 годзе ажаніўся.
б)Працаваў у адной са школ, дзе пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай, з якой у 1943 годзе ажаніўся.

16. Якія гады адпавядаюць гадам жыцця І.Мележа ў Сходні?
а)1943—1944;
б)1942—1944;
в)1942—1943;
г)1944—1945.

17. У якім годзе было апублікавана першае апавяданне І.Мележа?
а)1944;
в)1948;
б)1946;
г) 1947.

18. Якая назва першага апавядання І.Мележа?
а)«У завіруху»;
б)«Вераснёвыя ночы»;
в)«Сустрэча»;
г)«У гарах дажджы»;
д)«Па дарозе»;
е)«Досвіткі».

19. Сярод лепшых ранніх твораў І.Мележа літаратуразнаўцамі называецца апавяданне, напісанае на аўтабіяграфічным матэрыяле –даваеннай службы аўтара ў войску. Якая назва гэтага апавядання?
а)«У гарах дажджы»;
б)«Сустрэча»;

в)«У завіруху»;
г)«Таварыш»;
д)«Вераснёвыя ночы»;
е)«Па дарозе ».

20. «У гэтай кнізе нічога выдуманага. У ёй толькі тое, што было са мной асабіста ці з людзьмі. Гэта фактычна першая мая кніга», — так глядзеў на яе сам аўтар, нягледзячы на тое, што выдадзена яна была ўжо пасля яго смерці, у 1977 годзе. Якая назва гэтай кнігі?
а)«Мінскі напрамак »;
б)«Абеліск »;
в)«Першая кніга»;
г)«Дажыць да світання»;
д)«Людзі на балоце»;
е)«Жыццёвыя клопаты»;
ё)«Птушкі і гнёзды».

21. Асноўная частка літаратурна-крытычных прац І.Мележа змешчана ў кнізе, адзначанай Дзяржаўнай прэміяй БССР. Гэта:
а)“Праўдай адзінай”
б)“Звенні”
в)“І сняцца сны аб Беларусі...”
г)“Жыццёвыя клопаты”
д)“Доўгая дарога дадому”

22. Назавіце час, адлюстраваны ў рамане «Людзі на балоце» І. Мележа.
а)Першая сусветная вайна, грамадзянская вайна, калектывізацыя
б)Рэвалюцыйныя падзеі 1917 года, грамадзянская вайна
в)Пярэдадзень калектывізацыі і сама калектывізацыя
г)Вялікая Айчынная вайна
д)Пасляваеннае дзесяцігоддзе (1945-1955)

23. Галоўная праблема рамана «Людзі на балоце» І.Мележа:
а)Каханне
б)Барацьба за ахову прыроды
в)Жыццё людзей у час вялікіх сацыяльных зрухаў (калектывізацыя, яе ход, адмоўныя і станоўчыя бакі)
г)Барацьба з фашыстамі
д)Філасофска-анталагічныя пошукі

24. Хто з названых ніжэй герояў “Палескай хронікі” І. Мележа выступаў за калектывізацыю:

а)Сарока
б)Васіль Дзяцел
в)Апейка
г)Яўхім Глушак
д)Пракоп-лясун

25. Цэнтральнай сюжэтнай лініяй у “Палескай хроніцы” І.Мележа з’яўляецца лінія:
а)Апейкі
б)Міканора Дамеціка
в)Васіля і Ганны
г)Хадоські
д)сям'і Глушакоў (Карчоў)

26. Якія мясціны Беларусі апеў І.Мележ у сваёй творчасці?
а)Цэнтральную Беларусь
б)Беларускае Палессе
в)Заходнюю Беларусь
г)Віцебшчыну
д)Магілёўшчыну

27. Гэта адзін з самых паэтычных жаночых вобразаў беларускай літаратуры XX ст, увасабленне годнасці і гордасці. Але гэта гераіня вымушана пайсці замуж за нялюбага. У творы гераіня параўноўваецца з грушай: “Як тая груша, цвіла ў гэта лета…” Укажыце назву твора, яго аўтара, імя гэтай геріні
а)Палеская хроніка” І.Мележа. Ганна Чарнушка
б)Майка Раўбіч “Каласы… “Ул. Караткевіча
в)Волечка Нявада “Пошукі будучыні” К. Чорнага.
г)Зоська “Раскіданае гняздо” Купалы
д)Бандароўна Купалы

28. Якую назву мае другі раман «Палескай хронікі»?«Людзі на балоце»;
а)«Завеі, снежань»;
б)«У палескай глушы»;
в)«На ростанях»;
г)«Подых навальніцы»;
д)«У глыбі Палесся»;

29.Што стала матэрыялам мастацкага асэнсавання І.Мележа ўпершай і другой кнізе «Палескай хронікі»?
а)Жыццё палескай вёскі ў пярэдадзень і ў час так званай «сацыялістычнай перабудовы» яе.
б)Жыццё палескай вёскі ў час грамадзянскай вайны і ў перыяд калектыв'ізацыі.
в)Жыццё палескай вёскі ў перыяд рэвалюцыйных падзей 1917 года, грамадзянскую
г)вайну, пярэдадзень і час здзяйснення калектывізацыі.

30. Якія раманы «Палескай хронікі» засталіся недапісанымі, толькі ў накідах?
а)«Людзі на балоце»;
б)«Праўда вясны»;
в)«Подых навальніцы»;
г)«Завеі, снежань»;
д)«У палескай глушы»;
е)«У глыбі Палесся»;
ё)«За асакою бераг».

31. Пра якога героя, любуючыся ім, піша аўтар «Палескай хронікі»: «Рукі, душа яго прагнулі працы»?
а)Міканора;
б)Хоню;
в)Васіля;
г)Халімона;
д)Яўхіма;
е)Апейку.
ё)Сцяпана.

32. Каму з герояў «Палескай хронікі» належаць наступныя думкі- разважанні: «Уся сіла чалавека –у зямлі, і сіла ўся, і радасць. Няма зямлі – няма, лічы, і чалавека»?
а)Яўхіму;
б)Апейку;
в)Сцяпану;
г)Васілю;
д)Хоню;
е)Ганне;
ё)Міканору;
ж)Халімону;
з)Хадосьцы.

33. Якая ўдала знойдзеная дэталь у апісанні партрэта Васіля Дзятла дапамагае пісьменніку ўказаць на супярэчлівасць, дваістасць яго характару?
а)Васпаватасць твару;
б)панурыя ўпартыя губы;
в)розныя вочы: адно, «як вада, светлае, а другое, як жалудок»;
г)калматая, не то русявая, не то цёмная чупрына.

34. Вызначце адносіны аўтара да Васіля Дзятла.
а)І.Мележ малюе свайго героя з любоўю, сімпатыяй.
б)І.Мележ ідэалізуе свайго героя, пазбаўляе адмоўных рыс характару.
**в**)І.Мележ малюе свайго героя з любоўю і сімпатыяй, і разам з тым не хавае адмоўных якасцей яго характару.

35. Замест шматкроп’я ўстаўце імя гераіні «Палескай хронікі», змест вобраза якой так растлумачаны самім аўтарам: «У ... адбілася маё ўяўленне пра шчасце, пра каханне, пра самаахвярнасць. У гэтым вобразе і маё разуменне чалавечага гонару».

36. Ці пагаджаецеся вы з меркаваннямі І.Мележа ў тым, што, «аддаўшы» Ганну за Яўхіма, аўтар паграшыў супраць логікі развіцця гэтага характару?
а) Так; б) Не.

37. Каму з крытыкаў належаць наступныя словы: «Усё лепшае, што ёсць у нашым

народзе, нясе Ганна»?
а)Я. Брылю;
б)А. Адамовічу;
в)В. Каваленку;
г)Ф. Куляшову.

38. На якіх вобразах своеасабліва вырашаецца ў «Палескай хроніцы» праблема сапраўднай вартасці чалавека і яго асабістага шчасця?
а)Міканора;
б)Васіля Дзятла;
в)Халімона Глушака;
г)Башлыкова;
д)Яўхіма Глушака;
е)Хоні.

39. Каму з арганізатараў калектывізацыі на Палессі найбольш сімпатызуе аўтар «Палескай хронікі»?
а)Міканору;
б)Галенчыку;
в)Апейку;
г)Дубадзелу;
д)Башлыкову;
е)Харчаву.

40. Вызначце адносіны аўтара да калектывізацыі на Палессі.
а)Ухваляе надта паспешлівую гатоўнасць калектывізатараў «павярнуць жыццё на новы лад».
б)Асуджае калектывізацыю сталінскага тыпу, якая праводзілася сілавымі метадамі.

Адказы

1.а)
2.б)
3.а)
4.д)
5.д)
6.а)
7.б)
8.а)
9.в)
10.в)
11.б)
12.б)
13.в)
14.а)
15.а)
16.а)
17а)
18.в)
19.а)
20.в)
21.г)
22..в)
23.в)
24.в)
25.д)
26.б)
27.а)
28.г)
29.а)
30.б)ё)
31.в)
32.г)

33.в)
34.в)
35.Ганна
36.б)
37.б)
38.в),д)
39.в)
40.б).